жи, возможности самоутверждения, а также экономических стимулов, улучшения материального положения. Вместе с тем следует отметить, что ценность и эффективность деятельности ССО определялись также активной общественной, патриотической работой юношей и девушек по месту дислокации. Огромная помощь оказывалась ветеранам войны и труда в ремонте жилых помещений, местные школьные библиотеки пополнялись художественной литературой, подаренной студентами. В рамках военно-патриотического воспитания студенты вели поисковую работу по установлению имен неизвестных воинов, воздвигали памятники героям и жертвам войны. Заслуживает положительной оценки и инициатива студентов в оказании шефства над трудновоспитуемыми подростками. В целом, студенческое строительное движение, или третий семестр, оставило заметный след в формировании личности юношей и девушек.

Иллюстрацией творческой активности молодежи явились многочисленные любительские танцевальные, хоровые, музыкальные, театральные коллективы, хорошо известные за пределами республики. Они функционировали как при промышленных предприятиях, так и учебных заведениях. К примеру, широко известными в республике были коллективы БГУ: танцевальный ансамбль «Крыжачок», студенческий театр, хор преподавателей. Они сохранились до настоящего времени. Более того, создан и детский танцевальный ансамбль.

Вместе с тем к началу 80-х гг. наблюдалась тенденция к снижению социальной активности и угасанию творческой инициативы молодежи. Процессы стагнации в экономической и социальной сферах в изучаемый период повлекли за собой деформации в духовной сфере, не предлагая реальные стимулы для творческой деятельности молодых людей.

УДК 947.6

П.С. Кручак, асістэнт

ПРАБЛЕМЫ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ Ў ПРАЦАХ У.І. ПІЧЭТЫ

The article informs about U.I. Picheta's contribution to investigating problems of Belarusian statehood formation.

Выдатнейшы вучоны, адзін з заснавальнікаў беларускай нацыянальнай гістарыяграфіі У.І.Пічэта адлюстраваў у сваіх працах гістарычныя лёсы амаль усіх славянскіх народаў. Усяго ён напісаў больш за 500 прац па гісторыі Беларусі, Расіі, Украіны, Польшчы, Чэхіі, Сербіі і Балгарыі. Мы спынімся на асноўных праблемах беларускай дзяржаўнасці ў працах гісторыка.

Нарадзіўся У.І.Пічэта 9 кастрычніка 1887 г. у Палтаве, у сям'і святара, серба па нацыянальнасці. У 1897 г. ён закончыў Палтаўскую класічную гімназію, а ў 1901 г. – гісторыка-філалагічны факультэт Маскоўскага універсітэта. Лёс кідаў гісторыка па розных гарадах былой Расійскай імперыі. Ён выкладаў у Кіеве, Екацярынаславе і Маскве. Яшчэ да Кастрычніцкай рэвалюцыі У.Пічэта зацікавіўся беларускай культурай. Ён сябраваў з Я.Купалам, а з 1915 г. быў асабіста знаёмы з М.Багдановічам. У пачатку 1918 г. У.Пічэта абараніў доктарскую дысертацыю на тэму «Аграрная реформа Сигизмунда-Августа в Литовско-русском государстве».

У ліпені 1920 г. пасля вызвалення Мінска Чырвонай Арміяй узнавіла сваю дзейнасць камісія па стварэнню Беларускага універсітэта. Па прапанове ўрада БССР

гэту камісію ўзначаліў У.І.Пічэта. 8 чэрвеня 1921 г. Народны камісарыят асветы БССР прызначыў вучонага першым рэктарам БДУ. Вучоны займаў гэту пасаду да восені 1929 г. У гэты час ён выступіў у абарону арыштаваных выкладчыкаў універсітэта, за што і быў пазбаўлены пасады. А восенню 1930 г. У. Пічэта быў наогул арыштаваны па так званай справе «Платонава-Багаслаўскага». Абвінавачванні, вынесеныя супраць гісторыка, былі стандартнымі. Ён абвінавачваўся адначасова ў вялікадзяржаўным шавінізме, беларускім нацыяналізме і празаходняй арыентацыі. У жніўні 1931 г. пастановай Калегіі АДПУ ў пазасудовым парадку У.Пічэта быў высланы на 5 гадоў у Вятку. Беларускі перыяд яго жыцця і творчасці закончыўся.

Нягледзячы на кароткі перыяд жыцця ў Беларусі, гісторыя гэтай краіны займала адно з цэнтральных месцаў у творчасці У.Пічэты. Ён займаўся праблемамі этнагенеза беларускага народа і гісторыі дзяржавы і права Беларусі, гісторыяй беларускай мовы і літаратуры, беларускага кнігадрукарства і вышэйшай школы. З 516 работ вучонага больш за 150 прысвечана гісторыі Беларусі. Ужо адразу па прыбыцці ў Беларусь У.І.Пічэта напісаў артыкул «Чарговыя пытанні беларускай гістарыяграфіі», у якім падкрэсліў, што да апошняга часу гісторыя Беларусі не з'яўлялася сацыяльным аб'ектам навуковай увагі для даследчыкаў. Беларусь разглядалася як адна са складаных частак Кіеўскай дзяржавы, або як дамінуючая частка ў складзе Беларуска-Літоўскай дзяржавы, ці як непадзельная частка Расійскай імперыі. Таму, па меркаванню вучонага, гісторыя беларускага народа да апошняга часу не выяўлена гэтак жа дакладна і наглядна, як гісторыя ўкраінскага і рускага народаў. Гэта было звязана, на думку Пічэты, не толькі з тым, што прадстаўнікі пецярбургскай і маскоўскай гістарычных кафедр заўсёды прытрымліваліся традыцый юрыдычнай школы, але і з тым, што цэнтралістычна настроеныя даследчыкі бачылі ва ўсіх складаных славянскіх этнаграфічных фарміраваннях толькі адзіны, рускі народ, гісторыю якого яны заўсёды ўяўлялі як няўхільнае і сістэматычнае імкненне да нацыянальнага адзінства пад Маскоўскай уладай. У.І. Пічэта называў такі пункт гледжання метафізічным і прапанаваў правесці яго рэвізію. На думку вучонага, этнічныя беларусы чысцейшыя за ўкраінцаў і рускіх. Паводле свайго этнічнага складу беларусы адрозніваюцца ад усіх іншых этнічных фарміраванняў, і гэта з'яўляецца фундаментам для стварэння гісторыі беларускага народа, які з-за розных палітычных умоў і адносін не змог утрымаць сваё самастойнае нацыянальна-палітычнае быццё. У геаграфічных адносінах тэрыторыя, якую заняў беларускі народ, адасоблена басейнамі рэк у самастойны раён, які па сваіх асноўных прыродных характарыстыках адрозніваецца ад тэрыторый украінскай і велікарускай народнасцей. Вучоны падкрэсліваў, што адным толькі геаграфічным месцазнаходжаннем абумоўлены гістарычны лёс беларускага народа. Усё гэта дае лагічную падставу гаварыць пра гісторыю Беларусі як пра поўнасцю самастойнае цэлае ядро беларускага этнасу, якое, на думку У.Пічэты, злажылася ў выніку ўзаемнага ўплыву некалькіх усходнеславянскіх плямён – дняпроўскіх крывічоў, дрыгавічоў, радзімічаў і часткі драўлян. Канчаткова беларускі народ і беларуская мова сфарміравалася ў XIII-XIV стст.

Усходнеславянскія плямёны не мелі дзяржаўнага адзінства, а кожнае жыло паасобку і мела свайго правіцеля. Аднак у X ст. становішча змянілася. Полацкае і Тураўскае княствы папалі пад уладу Кіева. Праўда, гэта было хутчэй эканамічнае падпарадкаванне, чым палітычнае. Залежнасць Полацка ад Кіева была вельмі нядоўгай. У 1029 г. Яраслаў Кіеўскі быў вымушаны ўступіць Полацку частку зямель і тым самым фактычна прызнаць яго самастойнасць. Але барацьба паміж княствамі працягвалася.

Галоўную прычыну гэтай барацьбы У.Пічэта бачыў у спрыяльным геаграфічным становішчы Полацка, які кантраляваў значную частку гандлёвага шляху «з вараг у грэкі».Асабліва напружанай гэта барацьба стала пры Усяславе Чарадзеі, які з'яўляўся ўвасабленнем незалежнасці Полацкай зямлі ад Кіева і яе ўмацавання. У.І.Пічэта падкрэсліваў, што з сярэдзіны XII ст. усе тры (Полацкае, Смаленскае і Тураўскае) беларускія княствы канчаткова выдзеліліся са складу Кіеўскай дзяржавы і пачалі жыць сваім уласным жыццём. Палітычны ўклад на беларускіх землях быў пабудаваны на прынцыпе суіснавання трох элементаў улады – Народнага веча, князя і княжацкай думы. Адносіны паміж імі ладзіліся на моцы звычаю, з перавагай, аднак, у гэтай сістэме Народнага веча.

Вялікую ўвагу У.Пічэта ўдзяляў стану беларускіх зямель у складзе ВКЛ. Гісторык лічыў гэту дзяржаву Літоўска-Беларускай. Моцны штуршок для ўтварэння гэтай дзяржавы гісторык убачыў у нямецкай агрэсіі. Націск немцаў спрыяў умацаванню аб'яднальных імкненняў паміж літоўцамі і беларусамі. Пры гэтым у пытанні стварэння ВКЛ У.Пічэта прытрымліваўся погляду свайго настаўніка М.Доўнар-Запольскага. Ён падкрэсліваў, што адны землі ўвайшлі ў склад новай дзяржавы добраахвотна, заключыўшы спачатку дагавор. Другія былі ўключаны шляхам заключэння дынастычных шлюбаў, а трэція сталі ахвярамі ваеннага захопу.

Разглядаючы палітычны лад новай дзяржавы, У.Пічэта падкрэсліваў яго своеасаблівыя рысы. Вялікі князь прэтэндаваў толькі на знешняе прызнанне літоўскага суверэнітэту, не прэтэндаваў на самастойнасць народнага жыцця. Новая дзяржава нагадвала сабой федэрацыю абласцей, правы якіх гарантаваліся велікакняжацкімі актамі. Самастойнасць удзельных княстваў знікла толькі пры Вітаўце. Але ўсе землі атрымалі пры гэтым устаўныя граматы, якія замацоўвалі існуючыя мясцовыя звычаі і юрыдычныя нормы. У далейшым гэтыя граматы атрымалі сваё пацвярджэнне пры наступных літоўскіх князях – Казіміры, Аляксандры і Жыгімонце.

У.І.Пічэта лічыў, што ВКЛ у культурных адносінах з'яўлялася беларускай дзяржавай. Беларуская мова была мовай дзяржаўнай. Усе дзяржаўныя акты пісаліся па-беларуску. На гэтай жа мове пісаліся летапісы, хронікі, царкоўныя і свецкія творы. Найбольшы росквіт беларуская культура набывае ў XVI ст. Пры гэтым вучоны падкрэслівае, што ў XV і першай палове XVI ст. пануючыя класы заставаліся яшчэ вернымі нацыянальнай культуры і ўсякімі сродкамі дапамагалі яе развіццю.

Сітуацыя змянілася пасля заключэння Люблінскай уніі 1569 г. У.Пічэта вылучыў наступныя прычыны, якія прымусілі ВКЛ падпісаць гэты акт. Гэта, па-першае, імкненне шляхты атрымаць роўныя правы з польскай шляхтай. Па-другое, цяжкі фінансавы стан дзяржавы. Па-трэцяе, цяжкі ход Лівонскай вайны. ВКЛ спадзявалася на дапамогу Польшчы. Даючы свае ацэнкі уніі 1569 г., У.Пічэта падкрэсліваў, што яна зблізіла беларускую шляхту з польскай і тым самым садзейнічала засваенню ёю польскіх форм быту. Яе хуткая паланізацыя, заключэнне уніі прывялі да абвастрэння ўнутрыпалітычнай сітуацыі, узнікнення казацтва, выклікалі цэлы шэраг паўстанняў. Тым самым Люблінская унія дала больш адмоўных вынікаў, чым станоўчых. З яе і пачынаецца заняпад і ў рэшце рэшт гібель Рэчы Паспалітай. У.Пічэта падкрэсліваў, што ўваходжанне Беларусі ў склад Расійскай імперыі з'яўлялася такім жа адмоўным фактарам, як і палітычная яе сувязь з Польшчай. Прымусовае насаджэнне праваслаўя з'явілася фактарам, які нанёс вялікі ўрон беларускай мове і нацыянальнай культуры. Вельмі шкоднай для беларускай культуры была адміністрацыйная палітыка ўрада, імкненне знішчыць усе асаблівасці мясцовага права, мясцовага суда і ўстаноў. Такая

палітыка царызму магла стаць гібельнай для беларусаў. У.І.Пічэта шчыра вітаў Лютаўскую і Кастрычніцкую рэвалюцыі, мяркуючы, што новыя ўлады адкрыюць шлях для свабоднага развіцця ўсіх народаў.

Такім чынам, можна канстатаваць, што У.І.Пічэта з'яўляўся выдатным гісторыкам і грамадскім дзеячам. Ён унёс вялікі ўклад у фарміраванне беларускай нацыянальнай гістарыяграфіі.

УДК 378.147

А.В. Перевозный, доцент

НАЦИОНАЛЬНЫЙ УЧЕБНЫЙ ПЛАН И ДОВУЗОВСКИЕ КВАЛИФИКАЦИИ В АНГЛИИ

The articles studies the main functions of National Educational Plan and the system of preuniversity gualifications of England.

В 1988 г. правительство М.Тэтчер приняло образовательный акт (Education Reform Act), положивший начало широкомасштабным реформам в образовании. Одним из мероприятий, предпринятых с целью его практического осуществления, явилось создание Национального учебного плана (National Curriculum) для государственных начальных и средних школ (ныне они составляют приблизительно 90% от общего числа школ). Внедрение Национального учебного плана в систему школьного образования Англии носило революционный характер. Дело в том, что до 1988 г. перечень изучаемых предметов определялся администрациями школ самостоятельно, а содержание обучения каждой конкретной дисциплине было прерогативой учителя-предметника. В результате никто, кроме администрации и преподавателей, не мог точно знать, что именно преподается, на каком уровне трудности, соответствует ли этот уровень возрастным возможностям учащихся, требованиям времени и т.д. Проводившиеся в конце определенного периода обучения национальные испытания констатировали результат, не всегда удовлетворявший, однако влиять на учебный процесс со стороны, чтобы повысить уровень подготовки школьников, не было никакой возможности. Все это вызывало озабоченность политиков, промышленников, представителей других слоев общества. В ответ на эту озабоченность была усилена роль государства в управлении школами и, в частности, осуществлено внедрение Национального учебного плана, определившего содержание обучения всем предметам.

Его ключевыми функциями являются: обеспечение всем учащимся вне зависимости от социального происхождения, расы, пола, способностей возможности получения качественного общего образования; создание условий для самоактуализации личности; описание уровней, которые должны быть достигнуты учащимися при изучении всех школьных предметов; сохранение преемственности между ступенями школьного образования; обеспечение беспрепятственного перехода учащихся из одной школы в другую; создание фундамента для успешного непрерывного образования.

Эти функции Национального учебного плана носят долговременный характер, хотя сам он подвергается изменениям, с тем чтобы соответствовать общественной и экономической ситуации в стране, а также новациям, возникающим в теории обучения. В результате обсуждений в масштабе страны, предпринятых по инициативе соответствующих правительственных структур, Национальный учебный план корректировался